

# АСАБЛІВЫ СТАТУС АДНОСІН

**Аляксандр Лукашэнка асабіста праводзіў Эмерсана Мнангагву ў аэрапорце**

(Працяг на стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 МАЯ 2025 г. ПЯТНІЦА № 93 (30481)

# КАПРАМОНТ І РЭНАВАЦЫІ: ЧЫЙ ДОМ І КАЛІ?

**Штогод абнаўляецца звыш 3 мільёнаў «квадратаў»**



Капітальны рамонт — адна з галоўных жыллёва-камунальных паслуг. Гэта цэлы комплекс мерапрыемстваў. Як адзначыла намеснік начальніка ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Надзея СЯЎРУК, апошнім часам штогод капітальным рамонтам абнаўляецца больш за 3 мільёны квадратных метраў агульнай плошчы шматкватэрных жылых дамоў. Менавіта гэта не дапускае інтэнсіўнага зносу, хоць значная доля жылфонду была пабудавана яшчэ ў савецкі перыяд.

СТАР. 6

Фота носіць ілюстрацыйны характар.



+TV ПРАГРАМА

«ЗЯЛЁНЫ ФУРГОН»



КАМУ ТРЭБА АДКРЫЦЬ БАЗАВЫ РАХУНАК 4



ЯК МАШЫНАБУДАЎНІКІ ЗАМЯШЧАЮЦЬ ІМПАРТ 8–9

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

САЦЫЯЛЬНЫ КЛОПАТ

# АЎТОБУС ДАДОМУ? ЛЁГКА!

**Мінтранс запусціць пілотны праект для жыхароў маланаселеных вёсак**



Транспартнае ведамства зацвердзіла інструкцыю аб парадку ацэнкі мінімальных сацыяльных стандартаў у галіне транспартнага абслугоўвання насельніцтва. У рамках гэтага дакумента нарадзілася ініцыятыва пратэсціраваць пілотны праект для жыхароў населеных пунктаў з нязначным пасажырапатокам — іншымі словамі вёсачак, дзе насельніцтва складае некалькі дзясяткаў чалавек — як правіла, пажылых і тых, хто мае патрэбу ў медыцынскай ці іншай дапамозе. Сутнасць праекта ў тым, каб арганізаваць перавозку ці заказ транспартнага сродку жыхару такога населенага пункта ў зручны для яго час: па тэлефонным званку або праз мабільны дадатак. «Пілот» плануюць запусціць у найбліжэйшы час.

СТАР. 4–5

ISSN 1990 — 763X



# АСАБЛІВЫ СТАТУС

## Аляксандр Лукашэнка асабіста праводзіў

Візіт Прэзідэнта Зімбабвэ Эмерсана Мнангагвы ў Беларусь завяршыўся. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка асабіста праводзіў свайго калегу і сябра ў аэрапорце, што падкрэслівае асаблівы статус адносін. Дарэчы, у аэрапорт беларускі лідар прыехаў за рулём аўтамабіля.

# РАЗВАРОТ НА

## «Партнёрскія адносіны Беларусі перарастаюць аб актывізацыі супрацоўніцтва з краінамі

На гэтым тыдні мы былі сведкамі шырокага парадку міжнародных сустрэч Прэзідэнта Беларусі. Як адзначаюць спецыялісты, Беларусь уступіла ў новую эру міжнародных узаемаадносін. Напрыклад, падчас перагавораў з Прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагвам Аляксандр Лукашэнка заявіў, што двухбаковае супрацоўніцтва дзвюх дзяржаў — «гэта новы стандарт у рабоце з краінамі Афрыкі». Што з гэтага вынікае, расказалі нашы эксперты.

### СТАЎКА НА БУДУЧЫНЮ



У эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Аляксандр ШПАКОЎСКІ** звярнуў увагу на тое, як Беларусь рэалізоўвае шматвектарную эканамічную палітыку:

— 11 мая прыбыў Прэзідэнт Зімбабвэ, а 12 мая адбылася сустрэча з Генеральным сакратаром Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі В'етнама То Ламам. Гэта значыць, Беларусь адначасова дзейнічае на пляцоўцы Афрыкі і Паўднёва-Усходняй Азіі. Такая стратэгія называецца «разварот на Усход». Мы не проста пра гэта гаворым, мы гэта робім. Разумеем, што выжывальнасць беларускай эканомікі павінна быць забяспечана рэалізацыяй нашых экспартных інтарэсаў, у тым ліку ў краінах далёкай дугі.

Дэпутат перакананы: не трэба замыкацца выключна на расійскім рынку:

— Ва ўмовах спроб знешняй ізаляцыі мы шукаем магчымасці, партнёраў на розных напрамках. Бо эпоха Захаду адыходзіць, цэнтр навукова-тэхнічнага прагрэсу перамяшчаецца ў Паўднёва-Усходнюю Азію. Вельмі перспектыўнымі выглядаюць эканомікі Афрыкі, якія развіваюцца. Таму мы робім стаўку на будучыню, ствараем устойлівыя, дружалюбныя, даверлівыя сувязі з дзяржавамі, якія да гэтага гатовыя.

Сустрэчы Прэзідэнта з кіраўнікамі дзяржаў у пачатку мая выдатна ілюструюць накіраванасць беларускай дыпламатыі на выбудоўванне ўзаемавыгадных адносін з краінамі далёкай дугі, расказаў sb.by **кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры паліталогіі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Алег КАЗАК.**



— З аднаго боку, такі фармат сустрэч выдатна падыходзіць для абмеркавання новых перспектыўных праектаў, з іншага, кіраўнікі дзяржаў могуць падвесці прамежкавыя вынікі, ацаніць эфектыўнасць узаемадзеяння ў розных сферах. Многія краіны Азіі і Афрыкі маюць складаны каланіяльны досвед, які аказвае негатыўны ўплыў на іх развіццё і ў цяперашні момант. Беларускія тэхналогіі, прадукцыя машынабудавання (перш за ўсё сельскагаспадарчая тэхніка) здольныя дапамагчы дзяржавам далёкай дугі не толькі ўмацаваць харчовую бяспеку, але і адысці ад монаэканомікі, развіваць новыя галіны гаспадаркі.

Эксперт звярнуў увагу, што супрацоўніцтва Беларусі з краінамі глабальнага Поўдня пастаянна развіваецца і набывае новыя формы:

— Хацелася б адзначыць акцэнт на актывізацыю супрацоўніцтва паміж прадстаўнікамі малога і сярэдняга бізнесу ў пакеце дакументаў, падпісаных па выніках сустрэчы Прэзідэнтаў Беларусі і Зімбабвэ. Паказальна, што асаблівая ўвага аддаецца супрацоўніцтву ў сферы навукі, тэхналогій і інавацый (падпісанне адпаведнага мемарандума адбылося ў рамках сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі і лідара В'етнама То Лама), навучанню студэнтаў з дружалюбных краін у ВНУ Беларусі. Вельмі карысным для нашых партнёраў можа быць досвед беларускіх сілавых ведамстваў па дэкрыміналізацыі эканомікі і грамадскага жыцця (наша краіна паспяхова справілася з гэтымі праблемамі, якія ўяўлялі сур'ёзную пагрозу нацыянальнай бяспецы ў першыя гады існавання суверэннай Беларусі).

Дацэнт БДЭУ выказаў упэўненасць, што патэнцыял для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва Беларусі і краін далёкай дугі бязмежны:

**— Імпульс гэтаму супрацоўніцтву, безумоўна, надаюць сяброўскія адносіны лідараў дзяржаў, якія дапаўняюцца карпатлівай і сістэмнай работай міжурадавых, міжпарламенцкіх структур, інстытутаў «народнай дыпламатыі.**

### СЯБРОЎСТВА, ЯКОЕ ВЫТРЫМАЛА ВЫПРАБАВАННІ НА ТРЫВАЛАСЦЬ



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ДЗЯЧЭНКА** нагадаў, што сяброўства паміж беларускім і афрыканскімі народамі сваімі каранямі сыходзіць у савецкія часы і вытрымала выпрабаванне на трываласць:

— Калі ў другой палове мінулага стагоддзя народы Афрыкі сталі на шлях вызвалення ад еўрапейскай каланіяльнай залежнасці, менавіта Савецкі Саюз працягнуў ім руку дапамогі, падтрымаўшы на сесіі Генеральнай Асамблеі ААН 14 снежня 1960 года прыняцце Дэкларацыі аб прадастаўленні незалежнасці каланіяльным краінам і народам і аказаўшы ў далейшым велізарную гуманітарную, ваенную і тэхнічную падтрымку маладым афрыканскім краінам, якія выбралі сацыялістычную мадэль пабудовы грамадства, — праводзіць экскурс у гісторыю эксперт. — Нашы спецыялісты працавалі ў Алжыры, Анголе, Егіпце, Мазамбіку, Самалі, Эфіопіі і іншых дзяржавах. Афрыканская моладзь навучалася ў савецкіх установах вышэйшай адукацыі і тэхнікумах Беларусі.

Парламентарый канстатуе, што традыцыя раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з краінамі Афрыканскага кантынента ў розных сферах жыццядзейнасці грамадства прадоўжана і ва ўмовах суверэннай Беларусі:

— Дыпламатычныя адносіны ўстаноўлены з 52 з 54 незалежных дзяржаў, у тым ліку з афрыканскімі членамі БРІКС — Арабскай Рэспублікай Егіпет, Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікай Эфіопія і Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай. Праз беларускі парламент, у якім функцыянуюць шэсць рабочых груп па супрацоўніцтве з краінамі Афрыкі, мы падтрымліваем міжпарламенцкія сувязі і прасоўваем беларускі парадак дня ў гэтым рэгіёне планеты.

Алег Дзячэнка падкрэслівае, што на самым высокім узроўні двухбаковага ўзаемадзеяння наша краіна знаходзіцца з Зімбабвэ:

**— І заслуга ў гэтым належыць Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку, дзякуючы якому ўстаноўлены і дынамічна развіваюцца самыя цёплыя і дружалюбныя адносіны з кіраўніцтвам гэтай 15-мільённай афрыканскай дзяржавы.**

Эксперт адзначае, што сёння беларуска-зімбабвійскае супрацоўніцтва ахоплівае ўсе сферы — ад палітыкі і эканомікі да адукацыі і культуры:

— Пры гэтым варта падкрэсліць раўнапраўны і даверны характар міждзяржаўнага ўзаемадзеяння, у аснову якога пакладзены нацыянальныя інтарэсы нашых народаў.



**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей МЯЛЕШКІН** дапоўніў:

— Палітычныя сувязі адыгрываюць важную ролю, асабліва ў кантэксце падтрымкі адно аднаго на міжнароднай арэне. Што пацвярджаецца і асаблівым дружалюбным узаемадзеяннем беларускіх і афрыканскіх парламентарыяў.

### ДАЛЁКІЯ ПА АДЛЕГЛАСЦІ, АЛЕ БЛІЗКІЯ ПА ДУХУ



У тым, што Афрыканскі кантынент уяўляе ўсё большую цікавасць для Беларусі, перакананы і **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Віктар АНАНІЧ.** А самае галоўнае, адзначае парламентарый, што гэтая цікавасць узаемная:

— У Беларусі каласальны досвед эфектыўнага вядзення сельскай гаспадаркі, яе механізацыі, укаранення сучасных тэхналогій і навуковых распрацовак у галіне селекцыі. Усімі гэтымі дасягненнямі і напрацоўкамі наша краіна гатова дзяліцца з афрыканскімі партнёрамі, для якіх тэма харчовай бяспекі застаецца актуальнай з прычыны шэрага кліматычных фактараў, — канстатуе ён. — У сваю чаргу Афрыка цікавая Беларусі рэдказямельнымі карыснымі выкапнямі, у якіх маюць патрэбу многія галіны нашай эканомікі. Іх сумесная здабы-

# АДНОСІН

## Эмерсана Мнангагву ў аэрапорце

У аэрапорце кіраўнікі дзяржаў правялі сустрэчу, на якой падвялі вынікі рабочага візіту лідара Зімбабвэ ў Беларусь. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дзякуючы асабістаму ўкладу Эмерсана Мнангагвы паміж нашымі краінамі дасягнуты высокі ўзровень адносін. «Мы вельмі рады быць тут. І вельмі рады дынаміцы адносін, якія развіваюцца паміж Зімбабвэ і Беларуссю», — сказаў прэзідэнт Зімбабвэ.

Прэзідэнты абмеркавалі і анамальна халодны беларускі май. Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, на радзіме госцю прыйдзецца яшчэ прайсці праз акліматызацыю, хоць у Зімбабвэ цяпер зіма. Эмерсан Мнангагва пацвердзіў, што цяпер у Зімбабвэ сапраўды зімовы перыяд і часам па мясцовых мерках вельмі халаднавата. «Але беларускае надвор'е для нас вельмі камфортнае», — запэўніў ён.

«Гэта кажа пра тое, што вам трэба часцей бываць у Беларусі», — сказаў у адказ Аляксандр Лукашэнка. Лідары краін цёпла развіталіся. Эмерсан Мнангагва падзякаваў за выдатную арганізацыю візіту і запрасіў Аляксандра Лукашэнку ў найбліжэйшы час здзейсніць візіт у адказ у Зімбабвэ. «Вялікі дзякуй! Я павязу самыя лепшыя ўспаміны», — сказаў на развітанне прэзідэнт Зімбабвэ.

**Фота БелТА.**

# УСХОД

## у саюзніцкія»: эксперты — далёкай дугі

ча, з улікам тэхнічных магчымасцяў нашай дзяржавы, дапаможа знізіць залежнасць ад іншых краін, з якіх дадзеныя рэсурсы імпартуюцца.

Сенатар звяртае ўвагу, што менавіта сумесная здабыча мінералаў з'яўляецца ключавым праектам, які пакладзены ў аснову дарожнай карты стратэгічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Зімбабвэ на 2026—2030 гады.

На думку Аляксандра Шпакоўскага, сувязі Беларусі з дзяржавамі Афрыканскага кантынента прадоўжаць інтэнсіфікавацца, бо Зімбабвэ з'яўляецца адным з апорных пунктаў беларускай прысутнасці ў згаданым рэгіёне:

— Магу сказаць, што і гэта не фінальная падзея ў адносінах Беларусі з краінамі Афрыканскага кантынента. Мы працягнем лінію па нарошчванні прысутнасці нашай краіны ў Афрыцы, — выказаў упэўненасць ён, нагадаўшы, што па выніках мінулага года беларускі экспарт у Афрыку павялічыўся больш чым у 4 разы.

На думку аналітыка, ёсць усе падставы разлічваць, што і сёлета бакі будуць рухацца па нарастаючай у напрамку развіцця ўсяго спектра ўзаемадзеянняў і з Харарэ, і з іншымі партнёрамі ў Афрыцы:

**— У Беларусі ёсць свая стратэгія, якая заключаецца ў сумленным, адказным стаўленні да ўзятых на сябе абавязацельстваў.** Таксама мы не спрабуем проста дасягнуць нейкіх экспартных задач і зарабіць за кошт пашырэння прысутнасці ў Афрыцы. Замест гэтага мы прапануем нашым партнёрам у Афрыцы праекты ўзаемнага развіцця: стварэнне сумесных вытворчасцяў, перадачу тэхналогій, экспарт адукацыйных паслуг. Усё пералічанае прыцягвае афрыканскіх калег.



Самым важным, на думку **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, культуры і сацыяльным развіцці Тамары КРАСОЎСКАЙ,** з'яўляецца тое, што ўжо сёння Беларусь і Зімбабвэ падаюць прыклад альтэрнатыўнага партнёрства:

— Наш досвед можа натхніць іншыя краіны, якія стаміліся ад аднапалярнага дыктату, шукаюць новыя эканамічныя мадэлі ў абыход санкцый і долара, цэняць свой суверэнітэт без аглядкі на Захад.

На яе думку, партнёрства Беларусі і Зімбабвэ даказвае, што санкцыі — гэта не роўна ізаляцыя, гэта новыя магчымасці:

**— Такое супрацоўніцтва не проста ўзаемадзеянне дзвюх краін, яно задае трэнд, паказвае, што краіны Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, часткі Азіі і постсавецкія краіны могуць быць саюзнікамі ў розных напрамках у абыход Захаду. І гэта важны сігнал для ўсіх, хто хоча вырвацца з «правіл гульні», навязаных Вашынгтонам і Бруселем.**

Напрыканцы сенатар падкрэсліла:

— Нягледзячы на тое, што Беларусь і Зімбабвэ геаграфічна далёкія адно ад аднаго, але іх збліжае цэлы шэраг палітычных, эканамічных і нават каштоўнасных фактараў, можна з упэўненасцю сказаць, што нашы краіны блізкія па духу.

З НАГОДЫ

# ЗА ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ, ТАЛЕНТ І АДДАНАСЦЬ СПРАВЕ

## Прэм'ер-міністр Аляксандр ТУРЧЫН уручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам розных сфер

По даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь найлепшым прадстаўнікам працоўных калектываў краіны Прэм'ер-міністр уручыў учора ў Палацы Рэспублікі дзяржаўныя ўзнагароды.

— У гэтай зале прысутнічаюць тыя, хто сваім прафесіяналізмам, талентам, адданасцю справе і высокай адказнасцю ўнёс неацэнны ўклад у развіццё самых розных сфер нашага жыцця, кожная з якіх з'яўляецца фундаментам дабрабыту і працвітання нашай Радзімы, — адзначыў Аляксандр Турчын. — Ваша нястомная праца, майстэрства і энергія даюць магчымасць нам рухацца наперад. Вы — гонар нашай краіны.

Сярод узнагароджаных шмат работнікаў прамысловага комплексу, прадстаўнікоў энергетычнай галіны, дзеячаў культуры і мастацтва, прадстаўнікоў СМІ, дзяржаўных служачых.

— Праца ўсіх вас, а ў цэлым і народа Рэспублікі Беларусь, з'яўляецца неад'емным залогам незалежнасці і развіцця нашай краіны. Праца — гэта праяўленне нашай ідэнтычнасці, нашай культуры і нашых каштоўнасцяў. Кожны дзень мільёны людзей уносяць свой уклад у нашу агульную справу. Іх намаганні фарміруюць магутнасць краіны, умацоўваюць сацыяльныя сувязі і ствараюць будучыню для наступных пакаленняў, — звярнуў увагу кіраўнік урада.

Кожная з гэтых узнагарод з'яўляецца сведчаннем высокага прызнання працы, адданасці справе і любові да краіны.

— Няхай вашы дасягненні і ў далейшым служаць прыкладам для будучых пакаленняў і натхняюць усіх нас на новыя вышыні ў імя працвітання нашай любімай Беларусі, — пажадаў Прэм'ер-міністр.

Медаля Францыска Скарыны за шматгадовую плённую працу і высокі прафесіяналізм удастоены намеснік начальніка аддзела па асвятленні дзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь РУП «БелТА» Яўген Ваньшын (цяпер — галоўны рэдактар рэдакцыі па асвятленні дзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь). Падзяку Прэзідэнта за высокае прафесійнае майстэрства, значны асабісты ўклад у прымнажэнне і развіццё культурнага патэнцыялу краіны, арганізацыю і правядзенне рэспубліканскіх мерапрыемстваў з рук Прэм'ер-міністра атрымала галоўны рэдактар галоўнай рэдакцыі інфармацыі РУП «БелТА» Алена Круталевіч.

Акрамя таго, медалём «За працоўныя заслугі» адзначаны дырэктар ААТ «НДІстромаўталінія» Сяргей Шушкоў, стаж работы якога складае больш за 50 гадоў. Ён падкрэсліў, што ўдзячны за такую высокую ўзнагароду.

— У свой час я атрымаў вышэйшую адукацыю, а пасля гэтага займаўся ў асноўным навуковай дзейнасцю, праектаваннем абсталявання, яго вырабам, мантажом. Работа дае мне творчае задавальненне. Трэба прымаць рашэнні, падыходзіць да гэтага творча. Мне гэта падабаецца, — прызнаўся ўзнагароджаны.

Такую ж узнагароду за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі атрымала работніца ААТ «Мінскі трактарны завод» Галіна Ракавец. Яна — частка працоўнай дынастыі, таму што муж і сын таксама працуюць на трактарным. Усё жыццё жанчына прысвяціла рабоце ў цэху і адзначае, што яна цікавая і прыносіць адчувальны рэзультат.

— Ні да якіх узнагарод ніколі не імкнуся. Але вельмі ўдзячная за ўзнагароду, таму што гэта значыць, што я добра працую, — сказала Галіна Ракавец. — Вельмі цікава штосьці ствараць, гэта як складваць канструктар. Ёсць цікавасць атрымаць рэзультат. Вось здаецца, пра што гаварыць пасля работы, а мы з мужам, не паверыце, вельмі шмат тэхнічных пытанняў абмяркоўваем, і гэта вельмі цікава.

Сваімі ўражаннямі ад атрымання Падзякі Прэзідэнта падзяліўся і генеральны дырэктар ТАА «Прадзюсарская кампанія Аўра» Яўген Алейнік.

— У рамках «Марафону адзінства» ў нас прайшло 16 канцэртаў у лядовых палацах. Для мяне гэты прафесійны досвед значыў тое, што яшчэ раз пераканаўся: у краіне цудоўныя дарогі, па якіх можна хутка даехаць, цудоўныя палацы, гатовыя прыняць мерапрыемствы любога ўзроўню, выдатны персанал, гатовы на любых пляцоўках прымаць нас, — адзначыў ён. — Падзяка Прэзідэнта — сведчанне таго, што ўся мая каманда ідзе ў правільным напрамку, танцоры, харэографы, рэжысёры, якія разам з намі многія дзесяцігоддзі.

Не адыходзячы далёка ад каманды арганізатараў «Марафону адзінства», пацікавіліся меркаваннем намесніка дырэктара ТАА «Музычная медыякампанія» Тацяны Кулаковай аб узнагароджванні. Яна падкрэсліла, што атрымаць Падзяку Прэзідэнта было вельмі нечакана.

— Вельмі прыемна, ганарова, але гэта і абавязвае, паколькі ты разумееш, што працаваць трэба яшчэ больш і мацней, яшчэ больш адказна падыходзіць да многіх момантаў. Я як прадстаўнік «Музычнай медыякампаніі» павінна сказаць: мы будзем працаваць яшчэ лепш і больш на карысць нашай краіны, — заўважыла Тацяна Кулакова.



Фота БелТА.

**Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын узнагароджвае дырэктара дырэкцыі спецыяльных праектаў ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Алену Лобач.**

Генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін таксама быў адзначаны Падзякай Прэзідэнта.

— Па выніках «Марафону адзінства» — абсалютна беспрэцэдэнтнага праекта, які адбыўся ў нашай краіне, — мы бачылі вялікі грамадскі ўздым. Нават часам складана вызначыць жанр гэтага мерапрыемства. Я яго вызначаю як культурна-асветны фестываль, які падарожнічаў па гарадах нашай краіны, аб'ядноўваў розныя рэгіёны. Безумоўна, тыя эмоцыі, якія перажылі не толькі мы як арганізатары, але і тыя, хто прыходзіў на лекцыі, канцэрты, мітынгі, тыя, хто ўдзельнічаў у віктарынах, конкурсах, — усё гэта паказала еднасць нашай краіны, — лічыць ён. — Мы аб'ядналі ўсіх: ад нашых эстрадных выканаўцаў да бібліятэкараў, ад работнікаў прыватнай сферы да рабочых на заводах. Студэнты, школьнікі, спартсмены — усе былі ўключаны ў працэс. І гэта вельмі важна. Упэўнены, што нам трэба не страціць гэты тэмп, дынаміку, запал і энергію, якія прынёс у нашу краіну «Марафон адзінства».

Намеснік міністра адукацыі Кацярына Пятруцкая падкрэсліла, што вельмі ўдзячна за тое, што яе шлях даўжынёю 30 гадоў атрымаў такое высокае прызнанне — Падзяку Прэзідэнта.

— Гэта высокі гонар, але разам з тым абавязацельства працаваць яшчэ больш і лепш для таго, каб новыя пакаленні беларусаў былі сапраўднымі грамадзянамі і патрыётамі нашай краіны, былі моцнымі і ўпэўненымі, — адзначыла яна. — Педагог сёння — вялікі чалавек, у чыіх руках будучыня краіны.

Намеснік начальніка гандлёвага комплексу ААТ «ЦУМ Мінск» Алена Белабокава, узнагароджаная медалём «За працоўныя заслугі», расказала, што на сваё месца работы прыйшла яшчэ калі ёй было 19, і вось ужо 27 гадоў працуе на ім.

— Калі я даведалася, што мяне ўзнагароджваюць, мяне перапаўнялі эмоцыі. Слёзы наварочваліся на вочы. Аналагічныя эмоцыі я зведала, калі мне паведамілі аб узнагародзе «Мінчанін года». Вельмі прыемна, і я ганаруся сваім прадпрыемствам, таму што тут мяне навучылі працаваць на карысць дзяржавы, — падзялілася яна.

На заканчэнне цырымоніі ўзнагароджвання Прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын яшчэ раз павіншаваў узнагароджаных і звярнуў увагу, што ўсіх, хто сабраўся сёння ў зале Палаца Рэспублікі, аб'ядноўвае адно — любоў да краіны.

— Упэўнены, што гэта яшчэ не апошняя ўзнагарода ў вашым жыцці. Вы шмат яшчэ зробіце на карысць нашай роднай краіны, — рэзюмаваў кіраўнік урада.

**Паводле БелТА.**

ПАДЗЕЯ

# МАРКА ЯК СІМВАЛ ІНТЭГРАЦЫІ



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

## Уладзімір КАРАНІК узяў удзел у цырымоніі гашэння маркі ў гонар старшынства Беларусі ў ЕАЭС

**Новая марка да старшынства Беларусі ў ЕАЭС выйшла тыражом у 24 тысячы, яе намінал адпавядае тарыфу на перасылку простага пісьма масай да 20 г па краіне. Учора гэтыя маркі былі запушчаны ў абарачэнне.**

Падчас цырымоніі афіцыйнага гашэння паштовага праекта «Старшынства Рэспублікі Беларусь у органах Еўразійскага эканамічнага саюза ў 2025 годзе» намеснік Прэм'ер-міністра звярнуў увагу на знакавасць падзеі і падкрэсліў, што Еўразійская інтэграцыя — залог будучага росквіту нашых краін. Ён адзначыў, што наша дзяржава выходзіць з мноствам ініцыятыў у ЕАЭС. Сярод іх — зняцце бар'ераў, удасканаленне лагістыкі, роўны доступ да сістэмы дзяржзакупак і забеспячэнне бесперашкоднага руху тавараў, паслуг і капіталаў.

— Гэта значыць пытанняў, якія патрабуюць дадатковай прапрацоўкі, вельмі шмат. Але самае галоўнае, што яны знаходзяць разуменне ў нашых калег па Еўразійскім эканамічным саюзе: ідзе дашліфоўка па многіх кірунках, зняцце дробных заўваг. Па некаторых пытаннях — ініцыятывы рэвалюцыйныя, якія, з майго пункту гледжання, дазволяць лепш забяспечыць інтэграцыю нашых краін, а таксама дадуць магчымасць для адзіных адказаў на глабальныя выклікі і будуць спрыяць далейшаму паскоранаму развіццю дзяржаў — членаў ЕАЭС, — заўважыў віцэ-прэм'ер.

Уладзімір Каранік таксама падзякаваў удзельнікам конкурсу па распрацоўцы эмблемы старшынства Беларусі ў органах ЕАЭС. Конкурс праводзіўся сярод моладзі пад эгідай Міністэрства адукацыі. Пераможцам стала работа, распрацаваная **вядучым дызайнерам выдавецкага цэнтра «Марка» РУП «Белпошта» Марынай КРЭЗО**. На мерапрыемстве таксама прысутнічалі фіналісты конкурсу, якія атрымалі ўзнагароды.

**Паводле БелТА.**

ЭКАНОМІКА

# ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА

## Сістэма спажыўкааперацыі дазваляе забяспечыць сацыяльны стандарт гандлю на вёсцы

**Днямі прайшоў справаздачна-выбарны агульны сход прадстаўнікоў членаў Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў, удзел у якім прыняў намеснік Прэм'ер-міністра Юрый ШУЛЕЙКА.**

Профільны віцэ-прэм'ер адзначыў у гутарцы з журналістамі, што сама сістэма спажывецкай кааперацыі відазмяняецца, выходзячы з патрабаванняў часу:

— Трэба дакладна разумець, усе яны накіраваныя на работу са станоўчым эканамічным вынікам і тое, што звязана з сельскім насельніцтвам. Дзейнасць спажыўкааперацыі з'яўляецца неад'емнай часткай падтрымкі сельскага насельніцтва: гэта крамы спажывецкай кааперацыі, нарыхтоўчыя функцыі, у многіх раёнах спажывецкая кааперацыя мае свае вытворчыя цэхі па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі, прадукцыі жывёлагадоўлі, каб забяспечыць крамы спадарожнымі таварамі, прадуктамі харчавання. Мэта — глабальная.

Юрый Шулейка падкрэсліў: сістэма спажыўкааперацыі выконвае галоўную функцыю, забяспечваючы вяскоўцаў неабходнымі таварамі:

— Сёння аўтамабілі спажыўкааперацыі (якіх у сістэме парадку 480) прыязджаюць у 450 населеных пунктаў, дзе жыве па адным жыхару; у 4500 населеных пунктаў — па 10 жыхароў і ў 12 тысяч населеных пунктаў — па 50 жыхароў. Гэта сітуацыя накладае пэўныя выдаткі на эканоміку, якія трэба пакрываць. Таму заўсёды існуе паралельная вытворчасць, якая кампенсуе выдаткі.

Профільны віцэ-прэм'ер адзначыў, што ў цяперашні час праводзіцца комплексная работа па ўдасканаленні дзейнасці спажывецкай кааперацыі для годнага выканання ёю сваіх функцый:

— Работа не дзеля работы, а дзеля таго, каб эканоміка дазваляла генерыраваць прыбытак.

Ён дадаў, што галоўнае застанецца нязменным:

— У кожную вёску прыедзе сістэма спажывецкай кааперацыі і забяспечыць той стандарт, які сёння ёсць у сельскай краме або ў перасоўнай аўтакраме, што вязе не толькі прадукты харчавання, але і прамысловую групу, і выконвае заяўкі на спажывецкія тавары.

Падсумоўваючы, Юрый Шулейка падкрэсліў, што тыя задачы, якія паставіў перад галіной кіраўнік дзяржавы, выканальныя:

— На ўсё патрэбны час. Сёння дзяржавай робіцца ўсё неабходнае: ёсць сістэма падтрымкі, ільгатаванне банкаўскіх працэнтаў, асобныя крэдытныя лініі, абнаўленне машыннага парку і ўзаемадзеянне з мясцовымі ўладамі.

### Толькі лічбы

Сёння спажывецкая кааперацыя аб'ядноўвае 237 тысяч пайшчыкаў і 31 тысячу работнікаў.

За 2020—2024 гады сукупны аб'ём дзейнасці арганізацый спажыўкааперацыі склаў 16,8 мільярда рублёў.

За справаздачны перыяд на развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы сістэмы інвесціравана больш за 193 мільёны рублёў, у тым ліку ў гандаль 63 мільёны рублёў, або 33 % ад агульнага аб'ёму капітальных укладанняў. Адкрыта 97 гандлёвых аб'ектаў, праведзена мадэрнізацыя 365 крам, адрамантавана 1,1 тысячы аб'ектаў.

ПА ПАЛІЧКАХ

# ПЕНСІЯНЕРАМ, ЖАНЧЫНАМ

## Каму з 1 ліпеня трэба адкрыць базавы рахунак?

**З 1 ліпеня ўсе сацыяльныя выплаты, а гэта пенсіі, дапамогі па доглядзе дзяцей і па беспрацоўі, адрасная сацыяльная дапамога, а таксама стыпендыі і шэраг іншых будуць выплачвацца толькі на базавыя рахункі. Такім чынам дзяржава гарантуе атрыманне базавага сацыяльнага стандарту бясплатнага плацежнага абслугоўвання. Раскажам, каму трэба адкрыць такія рахункі і што для гэтага трэба зрабіць, у якіх выпадках яны не патрэбны і што будзе з грашыма, калі атрымальнік выплат не адкрые базавы рахунак.**

### У ЧЫМ ПЕРАВАГІ?

Як паведаміла **начальнік упраўлення электронных плацежных інструментаў Галоўнага ўпраўлення плацежнай сістэмы і лічбавых тэхналогій Нацыянальнага банка Вольга АНТАНОВІЧ**, з 1 ліпеня ўступае ў сілу норма Указа Прэзідэнта Беларусі № 363 «Аб бягучым разліковым банкаўскім рахунку фізічнай асобы з базавымі ўмовамі абслугоўвання». У адпаведнасці з ёй фізічныя асобы, якія атрымліваюць выплаты сацыяльнага характару і стыпендыі праз банкі, да 1 ліпеня 2025 года павінны адкрыць базавыя рахункі ці пераафарміць бягучыя рахункі ў базавыя.

Інстытут базавага рахунку ў нашай краіне быў створаны ў 2021 годзе, і з сакавіка 2022-га некаторыя банкі прапаноўваюць іх адкрываць. Адрозненне ад звычайнага бягучага разліковага базавага рахунку ў тым, што з уладальнікаў не спаганяюцца ўзнагароджанне і аплата на тэрыторыі Беларусі і ў інтэрнэце за аперацыі, якія ўключаны ў базавыя ўмовы абслугоўвання. Пералік такіх аперацый устаноўлены нарматыўнымі прававымі актамі.

Акрамя бясплатнага адкрыцця і закрыцця рахунку яго трымальнік можа без спагнання платы залічваць на яго розныя сацыяльныя выплаты, стыпендыі, пенсіі, здзяйсняць пераводы грашовых сродкаў паміж базавым і іншым рахункамі, якія належаць яму і адкрыты ў гэтым жа банку, пералічыць сродкі на іншы рахунак па прычыне яго закрыцця і пераносу базавага ў іншы банк ці пераафармлення ў бягучы рахунак. Па жаданні грамадзяніна для доступу да базавага рахунку банк бясплатна выпускае да яго банкаўскую картку плацежнай сістэмы Белкарт. З яе дапамогай можна разлічвацца за тавары, паслугі ў магазінах і інтэрнэце, бясплатна знімаць наяўныя ў банкаматах банка, у якім адкрыты рахунак.

— З увядзеннем інстытута базавага рахунку яго ўладальніку на заканадаўчым узроўні гарантавана магчымасць атрымання на бясплатнай аснове шэрагу плацежных паслуг, якія найбольш запатрабаваны ў паўсядзённым жыцці. Такім чынам дзяржава дае магчымасць грамадзянам атрымаць базавы сацыяльны стандарт бясплатнага плацежнага абслугоўвання і самастойна выбраць банк з ліку тых, хто бясплатна аказвае паслугу па адкрыцці базавых рахункаў, — адзначыла Вольга Антановіч.

### ЯК АДКРЫЦЬ?

Паслугі па адкрыцці базавых рахункаў у нашай краіне аказваюць 11 банкаў. Грамадзянін у праве выбраць з іх любую фінансавую ўстанову, прыйсці туды для адкрыцця рахунку (ці зрабіць гэта дыстанцыйна праз інтэрнэт, калі банк дае такую магчымасць). У банку спатрэбіцца запоўніць заяву аб адкрыцці базавага рахунку і падпісаць дагавор, які гэта прадугледжвае. Пры сабе неабходна мець пашпарт.

### ПРА ЯКІЯ ВЫПЛАТЫ ІДЗЕ РАЗМОВА?

Сёння сацыяльныя выплаты, якія прызначаюцца органамі па працы і сацыяльнай абароне, у асноўным выплачваюцца праз банкі. Як паведаміла **начальнік галоўнага ўпраўлення пенсіённага забеспячэння Міністэр-**

# АЎТОБУС ДАДОМУ?

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Транспартнае абслугоўванне — актуальная тэма, якая заўсёды выклікае жывую цікавасць грамадзян, асабліва тых, хто жыве ў малых гарадах або вёсках. Што зменіцца для жыхароў рэгіёнаў у транспартным абслугоўванні з прыняццем дакумента, якіх чакаць навацый, чытачам «Звязды» расказвае **начальнік упраўлення аўтамабільнага і гарадскога пасажырскага транспарту Міністэрства транспарту і камунікацый Андрэй ГЛАДКІ**.

— Адразу хачу сказаць, што сацыяльныя стандарты былі ўстаноўлены пастановай урада № 724 яшчэ ў 2003 годзе. Цяперашняя пастанова Міністэрства транспарту і камунікацый толькі ўдакладняе асобныя моманты і методыку вызначэння фактараў выканання гэтых стандартаў. Чагосьці кардынальна новага ў сістэму не прыўносіцца, — заўважыў начальнік упраўлення.

Паводле яго слоў, сацыяльныя стандарты ўстанаўліваюць гарантаваны ўзровень транспартных паслуг, які дазваляе задаволіць асноўныя патрэбы насельніцтва ў перамяшчэнні. Ацэнка іх выканання дасць магчымасць увесці аднастайны падыход пры аналізе работы па абслугоўванні насельніцтва ў адпаведнасці з нарматывамі.

— Калі гаворка заходзіць аб сацстандартах транспартнага абслугоўвання, маецца на ўвазе наяўнасць пасажырскіх тэрміналаў на аўтобусных маршрутах, ахоп транспартным абслугоўваннем, абслугоўванне насельніцтва ў рамках гарадскіх і міжгародних унутрыабласных аўтамабільных перавозак у рэгулярных зносінах, — растлумачыў кіраўнік упраўлення. — Напрыклад, нарматыў наяўнасці пасажырскіх тэрміналаў — адзін-два на раён. Прадугледжаны 100-працэнтны ахоп транспартным абслугоўваннем (з улікам чыгуначнага і ўнутранага воднага транспарту ў навігацыйны перыяд) адміністрацыйных цэнтраў сельсаветаў пры абавязковым выкананні не менш за 16 рэйсаў, з 2026 года — не менш за 20 рэйсаў у тыдзень. Для аграгарадкоў з колькасцю насельніцтва больш за 1 тысячу — не менш за 28 рэйсаў на тыдзень.

Андрэй Гладкі агучыў таксама і нарматыў транспартнага абслугоўвання ў рамках гарадскіх перавозак для гарадоў і гарадскіх пасёлкаў з колькасцю 10—30 тысяч — адзін аўтобус на 8 тысяч пасажыраў.

— Сацыяльныя стандарты вызначаюць агульныя падыходы дзяржавы да таго ці іншага пытання. У нашым выпадку маецца на ўвазе транспартнае абслугоўванне не толькі малых населеных пунктаў, але таксама і гарадоў, абласных цэнтраў. Устаноўлены адпаведныя параметры, — удакладніў Андрэй Гладкі. — Калі ў населеным пункце пражывае ад 30 да 50 тысяч чалавек, там — адзін аўтобус на 4 тысячы чалавек. Для гарадоў з насельніцтвам ад 50 да 250 тысяч прадугледжваецца адзін аўтобус (тралейбус, трамвай) на

# У ДЭКРЭЦЕ, СТУДЭНТАМ



ства працы і сацыяльнай абароны **Алена ГОМАРАВА**, амаль 80 % пенсіянераў атрымліваюць пенсіі праз банк. Для асобных сацыяльна ўразлівых катэгорый прадугледжана магчымасць атрымання грошай праз пошту, і гэтай магчымасцю яны карыстаюцца.

Што ж з 1 ліпеня можна атрымаць толькі праз базавы рахунак? Гэта пенсіі і дапамогі на дзяцей, якія выплачваюцца органамі па працы і сацыяльнай абароне; дапамогі па беспрацоўі і іншыя выплаты ад цэнтра занятасці; дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога; дапамога па доглядзе інваліда I групы ці асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту; выплаты асобам, якія ажыццяўляюць догляд у замяшчальнай сям'і; выплаты на блізнят; матэрыяльная дапамога да школы.

## ЧАМУ ЗВЯРНУЦЦА ТРЭБА ДА 20 ЧЭРВЕНЯ?

Большасць атрымальнікаў сацыяльных выплат ужо пераафармілі свае бягучыя разліковыя рахункі ў базавыя, адзначыла Алена Гомарава. Аднак ёсць асобныя катэгорыі, якія не паспелі гэта зрабіць.

— Таму просім усіх атрымальнікаў сацыяльных выплат у органах па працы і сацыяльнай абароне звярнуцца ў банк да 20 чэрвеня. Менавіта пасля гэтай даты фарміруюцца плацежныя ведамасці на ліпень. Таму, каб своечасова атрымаць пенсію ў ліпені, звярнуцца трэба да 20 чэрвеня, — патлумачыла начальнік упраўлення.

Ці адкрыты ў грамадзяніна базавы рахунак, можна ўдакладніць у банку ці органах па працы і сацыяльнай абароне. У цяперашні час органы па працы і сацыяльнай абароне інфармуюць грамадзян — усім накіраваны пісьмовыя паведамленні, каб яны своечасова звярнуліся ў банк, банкі таксама накіроўваюць адпаведныя смс-паведамленні.

## КАМУ НЕ ТРЭБА АДКРЫВАЦЬ?

Не маюць такой патрэбы атрымальнікі пенсій і дапамог, якія пералічваюцца на пошту. З 1 ліпеня для іх нічога не зменіцца. Што датычыцца дапамог на дзяцей, то, калі яны выплачваюцца па месцы работы ці вучобы, у такой сітуацыі адкрыццё базавага рахунку не патрабуецца. Калі мама працуе, сваю дапамогу па доглядзе яна атрымлівае на зарплатную картку і не мае патрэбы ў адкрыцці базавага рахунку.

Акрамя таго, базавыя рахункі не адкрываюцца асобам, якія не маюць віду на жыхарства. Дапамога замежным грамадзянам ці асобам без грамадзянства будзе выплачвацца на бягучы разліковы рахунак.

## ЦІ МОЖНА АДКРЫЦЬ АДДАЛЕНА?

Так, але такая паслуга аказваецца не ўсімі банкамі. Калі грамадзянін не можа звярнуцца ў банк для адкрыцця базавага рахунку асабіста, напрыклад, з-за немагчымасці самастойна рухацца, для такіх людзей (старэйшых за 70 гадоў і інвалідаў) прадугледжана магчымасць атрымання пенсіі праз пошту, у тым ліку і з дастаўкай дадому. Для гэтага трэба напісаць заяву ва ўпраўленне па працы і сацыяльнай абароне.

## ШТО БУДЗЕ З ПЕНСІЯЙ ТЫХ, ХТО НЕ АДКРЫЕ?

Сродкі не прападуць, а будуць выплачаны пасля адкрыцця такога рахунку. Таму, каб атрымаць выплаты своечасова, трэба загадзя паклапаціцца аб адкрыцці базавага рахунку.

## ЦІ МОГУЦЬ АДКРЫЦЬ ПРЫМУСОВА?

Банкаўскае заканадаўства не прадугледжвае прымусовае адкрыццё рахунку. Ён адкрываецца толькі ў прысутнасці і па жаданні грамадзяніна, які мае пры сабе пасведчанне асобы.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ЛЁГКА!



2 тысячы чалавек. Для гарадоў з насельніцтвам ад 250 тысяч да 1 млн — адзін аўтобус (тралейбус, трамвай) на 1,5 тысячы чалавек. Для Мінска нарматыў — адзін аўтобус (тралейбус, трамвай, вагон метрапалітэна) на 2 тысячы чалавек. Што тычыцца маршрутаў міжгародніх унутрыабласных аўтамабільных перавозак у рэгулярных зносінах (з улікам чыгуначнага транспарту і ўнутранага воднага транспарту ў навігацыйны перыяд), то прадугледжаны штодня адзін абарот, ці два рэйсы паміж раённым і абласным цэнтрамі.

Начальнік упраўлення падкрэсліў, што дзяржаўныя сацыяльныя стандарты па абслугоўванні насельніцтва Беларусі з'яўляюцца абавязковымі для арганізацый усіх форм уласнасці. Акцэнт у іх робіцца на тым, што абавязак па забеспячэнні перавозкі пасажыраў ускладзены на мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. У кожнай вобласці створана спецыяльная структура — аператары аўтамабільных перавозак, у кампетэнцыю якіх у тым ліку ўваходзіць разгляд і рэагаванне на звароты грамадзян з нагоды транспартнага абслугоўвання.

— Допусцім, узнікае патрэба ў дадатковым рэйсе або змене раскладу руху. Аператары праводзяць маніторынг і пры неабходнасці ўносяць змены ў тыя ці іншыя параметры, — тлумачыць Андрэй Гладкі. — Калі ёсць аб'ектыўныя падставы для змены маршруту або раскладу руху, то звароты грамадзян вырашаюцца станоўча.

Вяртаючыся да тэмы населеных пунктаў з нязначным пасажырапатокам, прадстаўнік Мінтранса зазначыў: «Сацыяльны стандарт прадугледжваецца ў тым ліку для населеных пунктаў з колькасцю ад 20 чалавек. Часцяком пусціць туды аўтобус няма магчымасці — не дазваляюць параметры дарогі. Тады ўводзіцца такая ацэнка, як зона ахопу транспартным абслугоўваннем, — каб да пэўнага прыпыначнага пункта можна было арганізаваць зносіны або пабудаваць прыпыначны пункт і адтуль пусціць аўтобусы. Зона ахопу такіх населеных пунктаў (з улікам чыгуначнага транспарту і ўнутранага воднага транспарту ў навігацыйны перыяд) вызначана да 3 кіламетраў».

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

ЭЛЕКТАРАЛЬНЫ СУВЕРЭНІТЭТ

# «ВЫБАРЫ — ГЭТА ЎНУТРАНАЯ СПРАВА СУВЕРЭННАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

## Асноўныя акцэнты рэспубліканскага семінара-нарады «Вопыт і перспектывы развіцця выбарчай сістэмы Рэспублікі Беларусь»

**По выніках кожнай электаральнай кампаніі Цэнтральная выбарчая камісія аналізуе прымяненне на практыцы выбарчага заканадаўства. Гэтымі днямі арганізатары выбараў з усіх рэгіёнаў краіны сабраліся ў Мінску, каб абмеркаваць вынікі выбарчага цыкла 2022 — 2025 гадоў, а таксама практыку прымянення абноўленага выбарчага заканадаўства пры правядзенні выбараў.**



Выступаючы на пленарным пасяджэнні семінара-нарады, **старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА** адзначыў, што мінулая прэзідэнцкая выбарчая кампанія не проста завяршыла працэс палітычнай мадэрнізацыі нашай краіны пасля рэспубліканскага рэферэндуму 2022 года, а, па сутнасці, вызначыла стратэгічны шлях далейшага развіцця.

Кіраўнік Цэнтрвыбаркама агучыў шэраг асаблівасцяў электаральнай кампаніі 2025 года. «Выбары кіраўніка дзяржавы праводзіліся на падставе абноўленых палажэнняў Канстытуцыі і Выбарчага кодэкса, якія поўнасцю адпавядаюць патрабаванням Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі па забеспячэнні электаральнага суверэнітэту як неад'емнага права дзяржавы самастойна праводзіць выбары і рэферэндумы без умяшання звонку, — канкрэтызаваў ён. — У ходзе кампаніі мы прадэманстравалі, што выбары — гэта ўнутраная справа суверэннай дзяржавы і мы не дапусцім знешняга ўплыву на ўнутраны палітычны працэс у нашай краіне».

Ігар Карпенка звярнуў увагу на тое, што ў сучасным свеце, калі размываюцца маральныя і этычныя нормы, як ніколі неабходна аб'яднаць намаганні розных дзяржаўных інстытутаў і грамадскіх аб'яднанняў для фарміравання ўстойлівага разумення грамадзянамі сваіх духоўна-маральных асноў, вытокаў патрыятызму, адказнасці за захаванне міру, згоды і бяспекі на нашай зямлі. «А гэта магчыма дасягнуць не толькі шляхам удасканалення прававой прасторы і правядзення работы па павышэнні прававой культуры насельніцтва, але і шляхам укаранення ў грамадстве агульнавядомых пастулатаў аб дабрыні і зле, праўдзе і сумленнасці, сацыяльнай справядлівасці і нацыянальнай ідэнтычнасці, вернасці і любові да бліжняга», — лічыць старшыня ЦВК.

Па яго словах, усё гэта знайшло адлюстраванне ў Дырэктыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 12 «Аб рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы». «Гэты нарматыўны прававы акт грунтуецца на канстытуцыйных палажэннях, а яго актуальнасць вызначаецца неабходнасцю далейшага развіцця канцэптуальных асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы, пошуку аптымальных шляхоў работы з насельніцтвам і, у першую чаргу, з моладдзю, — канстатаваў кіраўнік Цэнтрвыбаркама. — Гэта сугучна з адным з новых кірункаў дзейнасці Цэнтральнай выбарчай камісіі, якая сёння актыўна ўключылася ў працэс фарміравання прававой культуры моладзі, павышэння даверу грамадзян да выбарчай сістэмы».

Яшчэ адной асаблівасцю выбарчай кампаніі 2025 года, як адзначыў старшыня ЦВК, з'яўляецца беспрэцэдэнтна высокі ўзровень рэалізацыі прынцыпаў адкрытасці і галоснасці. «Гэтаму садзейнічала поўнамаштабнае інфармаванне насельніцтва аб ходзе выбарчай кампаніі, — перакананы Ігар Карпенка. — Выкарыстоўваючы розныя формы і метады інфармацыйнай работы ва ўзаемадзеянні ўсіх зацікаўленых дзяржаўных органаў і арганізацый, нам удалося стварыць атмасферу празрыстасці на ўсіх этапах кампаніі, што садзейнічала ўмацаванню даверу да выбарчай сістэмы ў цэлым».

Акрамя таго, значна пашырылася геаграфія міжнароднага назірання. «Для ўдзелу ў назіранні за выбарамі ў Беларусі Цэнтральнай камісіяй было акрэдытавана 486 назіральнікаў з 52 краін, — канкрэтызаваў старшыня ЦВК. — Гэтая колькасць назіральнікаў не з'яўляецца максімальнай у параўнанні з папярэднімі кампаніямі, а вось прадстаўніцтва краін у замежным назіранні можна назваць рэкордным».

Ігар Карпенка нагадаў, што нароўні са станоўчымі ацэнкамі міжнародных назіральнікаў і незалежных экспертаў, дэпутаты Еўрапарламента за некалькі дзён да выбараў прынялі рэзалюцыю аб непрызнанні выбараў у Беларусі. АБСЕ адмовілася пасылаць назіральнікаў, спаслаўшыся на позняе запрашэнне. «Усё гэта сведчыць аб тым, што калектыўны Захад не пакідае спроб ціску на нашу краіну з мэтай змены палітычнага курсу, — растлумачыў ён. — Мяркуючы па ўсім, такая палітыка будзе працягнута і далей. Таму задача ўмацавання дзяржаўнага суверэнітэту і бяспекі па ўсіх кірунках і ў электаральнай сферы, у прыватнасці, будзе заставацца ключавой для органаў дзяржаўнага кіравання ў наступны міжэлектаральны перыяд».

Старшыня ЦВК падкрэсліў, што выбары ў Беларусі праводзяцца выключна ў інтарэсах беларускага народа, і мы не павінны дапусціць якога-небудзь умяшання ў наша суверэннае права праводзіць выбары ў адпаведнасці з нашым выбарчым заканадаўствам. «Пры гэтым трэба разумець і тлумачыць насельніцтву, што калектыўны Захад ніхто не ўпаўнаважваў даваць ацэнку легітымнасці выбараў у Беларусі і ніхто не надзяляў яго выключным правам быць «галоўным» ацэншчыкам выбарчага працэсу ў суверэннай краіне, — акцэнтаваў увагу Ігар Карпенка. — Вынікі выбараў Прэзідэнта прызналі ўсе кандыдаты, якія ўдзельнічалі ў выбарчай кампаніі. Вынікі галасавання не апратэстоўваліся ў судах, не ініцыіраваліся працэдуры разгляду пытанняў аб канстытуцыйнасці або легітымнасці выбараў, прадугледжаныя беларускім заканадаўствам. Легітымнасць нашых выбараў таксама пацвярджаюць накіраваныя ў адрас выбранага Прэзідэнта віншаванні з больш як 40 краін свету».

Рэзюмуючы, Ігар Карпенка заўважыў, што выбарчы цыкл, які прайшоў, дае старт новаму этапу, нацэленаму на 2029-ты і 2030-ты гады. Таму актуальнасць рэспубліканскага семінара-нарады, па яго словах, абумоўлена неабходнасцю аналізу праведзенай работы ў ходзе прэзідэнцкіх выбараў, а таксама вызначэннем асноўных кірункаў дзейнасці па забеспячэнні электаральнага суверэнітэту на перспектыву.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона**: ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1

**Продавец:** ООО «Гастон Восток», 220114, г. Минск, пр. Независимости, 165а

| № лот | **Предметы аукциона, расположенные по адресу:** г. Минск, Подземные переходы, 3 | **Начальная цена без НДС, бел. руб. (снижена на 30 %)** | **Шаг аукциона, бел. руб.** |
|---|---|---|---|
| 1 | **Торговое помещение № 3,** общей площадью 62,3 кв. м, инв. номер 500/D-693237 | 292 311,60 | 14 615,58 |
| 2 | **Торговое помещение № 2,** общей площадью 51,0 кв. м, инв. номер 500/D-693236 | 239 461,60 | 11 973,08 |
| 3 | **Торговое помещение,** общей площадью 40,3 кв. м, инв. номер 500/D-693239 | 187 289,90 | 9 364,50 |

**Обременение: аренда.**
Подробная информация на сайте организатора аукциона

| № лот | **Предмет аукциона** | **Начальная цена без НДС, бел. руб.** | **Шаг аукциона, бел. руб.** |
|---|---|---|---|
| 4 | **Имущественные права (требования по передаче в собственность)** по договору от 01.12.2020 № 1/12-20, заключенного между ООО «Гастон Восток» и ООО «Бизнес ФМ», долевого строительства помещения общей площадью 1440 квадратных метров в Объекте «Реконструкция незавершенного строительством производственного корпуса по ул. З. Бядули, 13 под административное здание с помещениями общественного назначения. Подробная информация на сайте организатора аукциона ИПМ-Торги (www.ipmtorgi.by) | 1 603 000,00 долл. США.* (снижена на 30 %) | 80 150,00 долл. США. |

*(Цена продажи предмета электронных торгов фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долл. США по курсу НБРБ на дату проведения торгов)

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **12.06.2025 в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **11.06.2025 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00.
Ответственное лицо: Шуляк Артур Леонидович, тел. 8029-123-39-49

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

